Яўген ТОРШЫН, Дзяніс ДУК, Пётр ЗЫКАЎ, Аляксей КОЦ

# СПАСА-ПРААБРАЖЭНСКАЯ ЦАРКВА Ў ПОЛАЦКУ:
## вынікі архітэктурна-археалагічных даследаванняў 2017 года

*З 2015 года Спаса-Праабражэнская царква Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра ў Полацку даследуецца сумеснай архітэктурна-археалагічнай экспедыцыяй Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта і Дзяржаўнага Эрмітажа (Расія). За гэты час былі выяўлены ўнікальныя артэфакты (дзве пячаткі Еўфрасінні Полацкай), а таксама ўдакладнены многія пытанні гісторыі будаўніцтва царквы. Вынікі даследаванняў 2017 года змяняюць ранейшыя ўяўленні навукоўцаў аб тым, як выглядала царква ў розныя перыяды свайго існавання.*

Спаса-Праабражэнская царква – унікальны помнік архітэктуры, адзіная захаваная да сённяшняга дня пабудова полацкага манументальнага дойлідства XII ст. Яна была ўзведзеная ў другой чвэрці XII ст. па ўказанні Еўфрасінні Полацкай, ігумені манастыра[1]. У кантэксце тагачаснай архітэктуры ўсходнеславянскіх зямель пабудова вылучаецца асаблівай арыгінальнасцю архітэктурных форм. У Спаскай царкве даследчыкі бачаць найбольш ранні прыклад стварэння дынамічнай, накіраванай увышыню аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі, якая атрымае шырокае распаўсюджванне ў старажытнарускім дойлідстве толькі на мяжы XII–XIII стст.[2]. Асаблівую адметнасць надаюць царкве фрэскі, створаныя адразу пасля завяршэння яе пабудовы[3]. На сённяшні дзень гэта найбольш поўна захаваны на ўсёй тэрыторыі Старажытнай Русі ансамбль манументальнага жывапісу XII ст.

Новыя археалагічныя даследаванні царквы пачаліся ў 2015 г. у сувязі з падрыхтоўкай праекта яе рэстаўрацыі. Галоўная задача раскопак на першым этапе заключалася ў вывучэнні аснавання сцен і вызначэнні на асобных участках асаблівасцяў канструкцыі і глыбіні закладкі падмуркаў. Паводле тэхнічнага задання неабходна было закласці пяць шурфоў звонку храма і тры ўяго інтэр'еры. Вынікі аказаліся нечаканымі. Ужо ў самім пачатку работ у адным з шурфоў (№1) быў адкрыты фрагмент сцяны, што прымыкала перпендыкулярна да заходняга фасаду храма па восі паўночнай сцяны. Сцяна была з плінфы, пакладзенай на вапнава-цамянкавай рошчыне ўтэхніцы "са схаваным радам". Стала відавочна, што ў старажытнасці да храма прымыкала прыбудова (удадзеным выпадку – заходні прытвор – экзанартэкс, роўны па шырыні заходняму фасаду царквы). Будаўнічы матэрыял і тэхналогія будаўніцтва сцяны цалкам адпавядалі характарыстыкам цэнтральнага будынка царквы. Супадалі і ўзроўні дзённай паверхні, з якой пачыналася будаўніцтва. Такім чынам, нягледзячы на тое, што сцяна прыбудовы прымыкала да асноўнага аб'ёму храма без перавязі, абедзве часткі будынка ўзводзіліся адначасова ці на працягу аднаго будаўнічага перыяду. У 2015 г. былі знойдзеныя таксама рэшткі галерэй каля паўночнага і паўднёвага фасадаў[4].

У 2017 г. мэты і задачы рэстаўрацыйных работ і архітэктурна-археалагічных даследаванняў былі скарэктаваныя. Яшчэ ў 2016 г. пры рэстаўрацыі жывапісу ў інтэр'еры храма была заўважаная вільгаць на ніжніх частках сцен. Выдаленне слоя зямлі да аснавання сцен аказалася немагчымым з-за размяшчэння каля іх рэштак канструкцыі галерэй XII ст. Па прычыне адсутнасці надзейных тэхналогій кансервацыі і экспанавання моцна пашкоджаных фрагментаў муроўкі царквы было прынята рашэнне захаваць іх засыпанымі ў зямлі. Для прадухілення пранікнення вады ў муроўку, размешчаную ніжэй сучаснай дзённай паверхні, прадугледжвалася абараніць яе з дапамогай вертыкальнай гідраізаляцыі і гарызантальнага машчэння каля сцен будынка. Гэтыя работы патрабавалі папярэдніх археалагічных раскопак, якія б дазволілі атрымаць звесткі аб размяшчэнні і глыбіні залягання фрагментаў старажытных канструкцый для іх захавання. Раскопкі 2017 г. каля сцен храма павінны былі забяспечыць выяўленне ўсіх магчымых захаваных частак галерэй XII ст.

Было прынята рашэнне напачатку правесці рэстаўрацыйныя работы і суправаджальныя археалагічныя даследаванні з паўднёвага фасада, паўднёвай часткі ўсходняга фасада і паўднёвай апсіды царквы.

Аднак даследаванні не абмяжоўваліся толькі археалагічнымі раскопкамі. Сцены будынка пакрытыя

некалькімі слаямі тынкоўкі markознага часу. Верхнія яе слаі, нанесеныя ў ХХ і пачатку ХХІ ст., утрымліваюць у сваім складзе цэмент, які стрымлівае выпарэнне вады. Таму для асушэння сцен перад пачаткам археалагічных раскопак было вырашана зняць з фасадаў цэментныя тынкоўкі на вышыню да 2 м ад сучаснай дзённай паверхні.

Пасля правядзення гэтых работ стала відавочна, што сцены храма не раз рамантаваліся, а на асобных участках муроўка XII ст. цалкам страчаная. Асабліва моцна пашкоджаныя сцены на ўзроўні дзённай паверхні XVIII ст., што ўсяго на 10-20 см ніжэй за сучасную. На гэтым узроўні ў муроўцы была высечана глыбокая штраба для завядзення ў яе цаглянага машчэння, якое складалася з трох радоў брусковай цэглы (фармат: 27-28x14-15x7 см) і плінфы, якая выкарыстоўвалася паўторна. Дадзеная канструкцыя ўжо даўно не адводзіла ваду ад сцен, паколькі ў многіх месцах была пашкоджаная пахавальнымі ямамі, размешчанымі паблізу царквы.

Найбольш маштабныя (па плошчы і глыбіні) рамонтныя муроўкі былі раскрытыя на паўднёвай сцяне нартэкса. Тут знаходзіўся спуск у крыпту, пабудаваную ў XVIII ст. манахамі-езуітамі, якімутой час належаў манастыр. У XIX ст. арачны праём спуску быў замураваны, а прылеглая сцяна адрамантаваная цэглай (фармат 24,5x12,5x5,5 см) на вапнава-пяшчанай рошчыне. Рамонтная закладка займае ўсю вышыню прасла, якое адпавядае ў інтэр'еры храма нартэксу І падымаецца на вышыню да 1 м ад узроўню машчэння XVIII ст.

З захаду гэтую частку сцяны абрамляе лапатка з паўкалонай, размешчаная на вуглу царквы. Пасля зняцця тынкоўкі высветлілася, што яна цалкам складзеная з брусковай цэглы (пераважна з кавалкаў), па характары фармоўкі і памерах блізкай да цэглы XVII ст. На паверхні цаглін бачны паралельныя лініі, зробленыя пальцамі (г. зв. цэгла-пальчатка). Некаторыя цагліны пакрытыя палівай. Гэты будаўнічы матэрыял, верагодна, паходзіў з адной са знішчаных пабудоў. Пад лапатку быў усталяваны новы падмурак з валуноў на рошчыне, ён быў прасочаны з ніжняй адзнакі машчэння XVIII ст.

След першапачатковай лапаткі XII ст., сцясанай да плоскасці фасада, бачны на 15 см на ўсход ад краю існуючай цяпер. Лапатку, верагодна, перанеслі ўжо ў XVII ст. Рошчына, выкарыстаная ў муроўцы, утрымлівае шэры пясок, што характэрна для рамонтных канструкцый і тынковак гэтага часу ў сценах царквы. Поўная перабудова лапаткі адбылася, магчыма, пры разборы канструкцый галерэй храма.

На суседнім (заходнім) прасле паўднёвага фасада храма першапачатковая сцяна была цалкам, амаль на ўсю шырыню, перакладзеная ў XIXст. Гэтае назіранне зроблена на ўсім участку, ачышчаным ад тынкоўкі. Муроўка з позняй цэглы бачная ў інтэр'еры царквы ўнутры размешчанага на дадзеным адрэзку сцяны аркасолія.

Паласа муровак XIX ст. праходзіць праз усе праслы і лапаткі з паўкалонамі паўднёвага фасада. Яна пачынаецца на ўзроўні машчэння XVIII ст. і падымаецца на 1-1,5 м. Такія ж рамонтныя ўстаўкі можна бачыць на паўднёвым прасле ўсходняга фасада і на ачышчаным ад тынкоўкі ўчастку апсіды. Гэты рамонт, верагодна, быў выкліканы разбурэннем старажытнай муроўкі ад празмернай вільготнасці і адбываўся ў 1830-я гг., калі храм набыў свой сучасны выгляд.

Адзначым, што за межамі позніх закладак на фасадзе захавалася паверхня муроўкі XII ст. у выглядзе бакавых паверхняў плінфы з рошчынным пакрыццём схаваных радоў.

Як вядома, сцены царквы былі складзеныя з плінфы на вапнава-цамянкавай рошчыне ў тэхніцы муроўкі "са схаваным радам", што прадугледжвала чаргаванне гарызантальных радоў плінфы, адзін з якіх выходзіў на паверхню сцяны, а другі быў паглыблены ў тоўшчу муроўкі. Рад плінфы ў глыбіні сцяны быў закрыты спачатку слоем рошчыны, які падразаўся наўскос ад верхняга выступаючага рада цаглін. Такім спосабам прыбіраўся лішак рошчыны, выдалены са швоў. Затым схаваны рад яшчэ раз пакрываўся слоем рошчыны, які падразаўся наўскос знізу і зверху і старанна загладжваўся.

Унутраная частка сцен галерэй і асноўнага аб'ёму царквы запаўнялася суцэльнай муроўкай без раздзялення на забутоўку і знадворныя вярсты. У запаўненні захоўвалася гарызантальнасць радоў плінфы, што адпавядалі радам паверхні сцяны. Асобныя канструкцыйныя вузлы сцен складаліся з валуноў, змацаваных рошчынай.

Паверхні сцен XII ст. пачаткова былі пакрытыя тоўстым (да 2 см) слоем старанна зацёртай вапнава-цамянкавай рошчыны, афарбаванай светлай вохрай. Падобная тынкоўка наносілася на рошчыну, што перакрывала "схаваны" рад плінфы. Такія ўчасткі захаваліся каля выступаючых лапатак на паўднёвым фасадзе і ў месцы прымыкання апсіды да ўсходняга фасада (а таксама на заходнім адхоне ўсходняй кутняй лапаткі паўднёвага фасада).

На вышыні 2,86-2,9 м ад падэшвы сцяны і 1,86-1,90 м ад сучаснай дзённай паверхні ў рошчыне XII ст. на ачышчаных ад позняй тынкоўкі ўчастках было прасочанае "прыпыначнае шво", якое адзначала завяршэнне першага сезона будаўніцтва.

Па заканчэнні будаўнічага сезона верхні рад плінфы, які выступаў на аблічную паверхню сцяны, перакрываўся слоем рошчыны, які падразаўся па краях такім чынам, што атрымоўваліся дзве наклонныя фаскі вонкі і ў інтэр'ер будынка. Пры ўзнаўленні будаўніцтва старая рошчына закрывалася новай, на якую клаўся рад плінфы, што, як і папярэдні, выходзіў на паверхню сцяны. Гэта добра заўважна дзякуючы адсутнас-

ці паміж двума радамі плінфы, выступаючымі на паверхню сцяны, схаванага рада, а таксама па выразным шве паміж рошчынай, пакладзенай да і пасля перапынку ў будаўніцтве[5].

На паўднёва-ўсходнім куце царквы на ўсходнім і паўднёвым фасадах знаходзіліся дзве лапаткі з паўкалонамі. Яны судакраналіся аснаваннямі праматвугольных уступаў, захоўваючы першапачаткова поўны профіль сячэння. Вугал храма быў моцна пашкоджаны. Пры рамонцеўXXст. профіль гэтага вузла быў аднолены з дапамогай цаглянага "жвіру" і рошчыны, якая ўтрымлівала цэмент. Кутняя лапатка на ўсходнім фасадзе была счасаная цалкам падчас рамонта Спаскага храма ў 1830-я гг.

На яе месцы на адлегласці 0,38 м ад сучаснага вугла храма, на вышыні 2,21 м ад падэшвы сцяны (узровень "прыпыначнага шва"), быў выяўлены канал для ўнутрысценнай драўлянай сувязі. Для яе вырабу выкарыстоўваліся драўляныя брусы, што размяшчаліся ў тоўшчы сцен (гэта характэрна для старажытнарускіх і візантыйскіх пабудоў), якія стваралі некалькі гарызантальныхС амкнутых паясоў. Яны служылі каркасам будынка і стрымлівалі яго дэфармацыі і разбурэнні пры нераўнамерных нагрузках[6]. Дадзеная сувязь была зроблена ў пачатку другога будаўнічага сезона, брусы клаліся зверху на слой рошчыны, які закрываў муроўку падчас перапынку ў будаўніцтве. Калі ў 1830-я гг. была счасана фасадная лапатка, канал драўлянай сувязі заклалі цэглай на рошчыне.

Драўляная ўнутрысценная сувязь мела праматвугольнае падквадратнае сячэнне памерам 20х22 (вышыня) см. Канал ад сувязі прасочаны ўнутры паўднёвай сцяны на дліну да 3 м, г. зн. дасягаў адхону сучаснага паўднёвага партала. Яго краі ўтвараліся слаямі муровачнай вапнава-цамянкавай рошчыны. На адлегласці 0,36 м ад усходняга фасада, унутры паўднёвай сцяны, было адкрыта перасячэнне з каналам перпендыкулярнай сувязі, якая праходзіла ўнутры ўсходняй сцяны. У інтэр'еры апсіды тарэц гэтай сувязі быў падрублены і пачаткова закрыты фрэскавай рошчынай, якая асыпалася пасля выгнівання бруса. Цяпер выхад канала сувязі ў інтэр'ер апсіды закрыты позняй рошчынай.

Унутры канала ў месцы перасячэння брусоў паўднёвай і ўсходняй сцен знойдзены жалезны каваны кастыль, які заставаўся там дзякуючы зацёкам рошчыны знізу і зверху. Ён меў квадратнае сячэнне і даўжыню 20 см. Каля знешняй замуроўкі канала на ўсходнім фасадзе знойдзены драўляны калок з абрыўкам пяньковай вяроўкі. Датаваць дадзены прадмет цяжка, але адбіткі ад падобных калкоў, якія выкарыстоўваліся пры разметцы падчас будаўніцтва, бачныя на паверхні старажытнай тынкоўкі завяршэння храма.

Вывучэнне ніжняга пояса сцен Спаса-Праабражэнскай царквы працягвалася падчас архітэктурна-археалагічных даследаванняў, якія дазволілі раскрыць участкі фасадаў асноўнага аб'ёму храма, размешчаныя ніжэй узроўню машчэння XVIII ст., і рэшткі паўднёвай галерэі XII ст.

Археалагічныя даследаванні праводзіліся ў раскопе 1 (агульная даўжыня – 15,78 м, а шырыня каля паўднёвага фасада – да 3,75 м і каля ўсходняга – да 1,5 м). Вывучэнне культурнага слоя і будаўнічых канструкцый адбывалася толькі да ўзроўню верхняй адзнакі падмуркаў цэнтральнага аб'ёму будынка, бо працяг раскопак на большую глыбіню мог пагражаць стану будынка.

Ніжнія рады муроўкі XII ст. усходняга фасада і апсіды, што знаходзіліся ніжэй сучаснай паверхні і сутыкаліся з зямлёй, захаваліся да нашага часу з моцнымі пашкоджаннямі. Як правіла, цалкам страчаны слой старажытнай тынкоўкі, а таксама разбураныя паверхні плінф і вапнава-цамянкавай рошчыны, якія перакрывалі "схаваны рад". Ацалелая паверхня старажытнай муроўкі ў многіх месцах адслаілася ад масіву сцяны і пакрытая дробнымі расколінамі і кавернамі.

Муроўка счасанай кутняй лапаткі з паўкалонай на ўсходнім фасадзе захавалася ніжэй узроўню XVIII ст., але моцна пашкоджаная. Можна ўбачыць толькі агульныя абрысы гэтай дэталі.

На паўднёвым фасадзе каля падэшвы сцяны захаваўся вялікі ўчастак першапачатковай тынкоўкі вышынёй да 55 см. Да яго прымыкаў фрагмент знешняга машчэння XII ст., што ўяўляла сабой суглінак, пакладзены на гарызонт культурнага слоя, які застаўся ад будаўніцтва храма. На слоі суглінку захаваўся невялікі ўчастак вапнава-цамянкавай рошчыны, на які, верагодна, быў пакладзены слой плінфы (захавалася адна цагліна). Машчэнне XII ст., таўшчынёй каля 40 см, закрывала ніжнюю частку муроўкі, пачынаючы ад яе аснавання. Фрагмент такога ж машчэння быў выяўлены ў 2015 г. у шурфе ў паўночнай частцы ўсходняга фасада і каля заходняга фасада заходняй галерэі, што пацвярджае прымыканне дадзенай канструкцыі да ўсяго перыметра царквы[7].

Пад аснаваннем сцен XII ст. на глыбіні каля 1 м ад сучаснай паверхні была раскрытая верхняя частка муроўкі падмурка. Падмурак складаўся з валуноў, пакладзеных насуха, і меў аднолькавую канструкцыю пад усімі сценамі царквы. Падмурак быў укладзены ў роў, заглыблены ў мацярык (светла-карычневы суглінак). Паміж камянямі ў многіх месцах засталіся пустоты. Ад знешняй плоскасці фасада падмурак выступаў у верхняй частцы на 0,4-0,5 м. Верхняя зона падмуркавай муроўкі ўздымалася над дзённай паверхняй пачатку будаўніцтва і была прысыпаная перакладзеным суглінкам з лінзамі гумуса. Глыбіня залажэння падмурка склала 1 м (паводле даных, атрыманых у 2015 г. у зандажы ў шурфе 2).

Адной з задач раскопак 2017 г. з'яўлялася вывучэнне рэшткаў галерэі XII ст. Меркавалася, што паў-

днёвая прыбудова размяшчалася ўздоўж усяго фасада і пачыналася каля паўднёва-ўсходняга вугла. Па версіі плана Спаскай царквы, створанай па выніках археалагічных даследаванняў 2015 г., галерэя і храм павінны мець агульны ўсходні фасад[8]. Такое размяшчэнне галерэй было характэрнае для храмаў Старажытнай Русі XII ст. Аднак ніякіх старажытных канструкцый XII ст. каля ўсходняга прасла паўднёвага фасада знойдзена не было. Даследаванні паказалі, штоўсходняя сцяна паўднёвай галерэі знаходзілася па восі ўсходняй лапаткі цэнтральнага прасла наоса царквы.

Сцяна галерэі складалася з некалькіх участкаў. Да фасада храма прымыкаў прамы адрэзак муроўкі даўжынёй усяго 75 см і таўшчынёй, роўнай шырыні фасаднай лапаткі (107 см). Плінфяная муроўка захавалася толькі на гэтым участку на вышыню да 60 см.

Працяг сцяны быў прасочаны ўжо па падмурку, які ў некаторых месцах быў пашкоджаны ці значна выбраны. Наступны адрэзак уяўляў сабой апсіду шырынёй у інтэр'еры каля 1,4 м. Вызначыць дакладныя памеры цяжка, паколькі яе падмурак пашкоджаны пахаваннямі. Шырыня падмуркавага рова скпадала 0,75 м.

Падмурак выкладзены з валуноў насуха. Падэшва падмурка паглыбленая ў траншэю, выкапаную ў мацерыку і запоўненую пераадкладзеным суглінкам з гумусам і будаўнічым смеццем. Апошняе трапіла ў падмуркавы роў пры разборы каменнай муроўкі. Ад самага падмурка засталося толькі некалькі груп камянёў.

На паўднёвым баку апсіды быў раскрыты блок муроўкі з плінфы на вапнава-цамянкавай рошчыне, які належаў да апсіды паўднёвай галерэі. Захаваўся кавалак сцяны з выгнутай інтэр'ернай паверхняй, гэты блок ляжаў не на сваім месцы і быў некалькі змешчаны з падмурка. Непасрэдна пад плінфянай муроўкай залягаў слой будаўнічага смецця.

На поўдзень ад падмуркавага рова апсіды па восі лапаткі паўднёвага фасада выяўлена скапленне валуноў, якія, відавочна, з'яўляліся рэшткамі падмурка паўднёвага прамога адрэзка сцяны галерэі. У межах раскопу аказаўся толькі паўночны край рова, яго працяг быў адкрыты яшчэ ў 2015 г. у шурфе 3[9].

Наступная папярочная сцяна паўднёвай галерэі была выяўлена каля заходняй лапаткі цэнтральнага прасла наоса царквы (усходняя палова гэтай сцяны была вывучана яшчэ ў шурфе 3 ў 2015 г.)[10]. Яна прымыкала да фасада цэнтральнага аб'ёма храма так, што яе заходняя аблічная паверхня супадала з заходняй гранню плоскага ўступа лапаткі, а ўсходняя з усходнім краем, які знаходзіўся на лапатцы паўкалоны. Ад сцяны захаваліся толькі канструкцыі, якія прымыкалі да сцяны царквы: невялікі ўчастак падмурка і размешчаны вышэй фрагмент муроўкі з плінфы даўжынёй 0,75 м, таўшчынёй 0,9 м і вышынёй да ўзроўню машчэння XVIII ст. Астатнюю частку сцяны ўдалося трасіраваць па падмуркавым рове.

Да заходняй лапаткі наоса была прыбудаваная яшчэ адна папярочная сцяна галерэі XII ст. Яна захавалася ў даўжыню на 3,31 м. Усходняя паверхня сцяны прымыкала да паўкалоны лапаткі на 12 см на ўсход ад яе цэнтральнай восі. Шырыня сцяны дасягала 1 м. На найбольш высокім участку ацалелая муроўка ўздымалася на 58 см ад урэзу падмурка. Узровень верху падмурка папярочнай сцяны супадаў з адзнакай урэзу падмурка паўднёвай сцяны цэнтральнага аб'ёму царквы. На ацалелым фрагменце сцяны не знойдзена слядоў праёма ў суседняе заходняе памяшканне паўднёвай галерэі.

З заходняга боку гэтай сцяны знаходзіўся спуск у падцаркоўе, зроблены ў XVIII ст. ужо пасля разбурэння галерэй XII ст. Ён займаў усю шырыню прасла наоса і ўключаў цагляныя сцены прыямка і лесвіцу. Усе гэтыя канструкцыі складзеныя з брусковай цэглы на вапнава-пясчанай рошчыне. Пры будаўніцтве спуску ў крыпту рэшткі сцяны ўжо разбуранай да таго часу галерэі былі яшчэ раз пашкоджаныя на адлегласці 1,98 м ад фасада храма.

На ўсёй плошчы кампартымента галерэі, размешчанага на ўсход ад сцяны на восі заходняй лапаткі наоса, была раскрыта праслойка рошчыны, якая перакрывала слой суглінку з дамешкамі рошчыннага россыпу і гумусу. Рошчынная сцяжка знаходзіцца на адным узроўні з абрэзам падмурка папярочнай сцяны і рыхтавалася пад падлогу ў гэтай частцы інтэр'ера галерэі.

На заходнім прасле паўднёвага фасада наоса храма, пачаткова скіраваным у інтэр'ер паўднёвай галерэі, відаць, адразу пасля завяршэння будаўніцтва царквы была высечана пахавальная ніша – аркасолій. Глыбіня яе складала: ад плоскасці фасада храма ля заходняга края прасла – 19 см, ад усходняга краю – 14 см. Для будаўніцтва аркасолія была счасаная амаль напалову ніжняя частка заходняй лапаткі і паўкалоны такім чынам, што заходняя сцяна нішы знаходзілася ў адной плоскасці з усходняй паверхняй сумежнай у гэтым месцы папярочнай сцяны галерэі. Глыбіня нішы ад паверхні паўкалоны заходняй лапаткі наоса склала 50 см. З усходняга боку прастора, прызначаная для пахавання, таксама была павялічаная пры дапамозе вырубкі ў тоўшчы муроўкі лапаткі і сумежнай папярочнай сцяны. Дно нішы знаходзілася на 20–30 см глыбей за ўзровень рошчыннай сцяжкі ў інтэр'еры.

Унутраная прастора нішы была абмежаваная (з боку інтэр'ера) дзвюма сумежнымі сценкамі, складзенымі з вузкай плінфы, шырынёй 14-15 см на вапнава-цамянкавай рошчыне, аналагічнай рошчыне муроўкі сцен храма і галерэі. Бок знешняй сцяны, скіраваны ў інтэр'ер галерэі, уяўляў сабой неўпарадкаваную муроўку, якая складалася з дзвюх гарызантальных захваток. Няроўнасці паверхні гэтага боку сцяны паказваюць, што яна межавала з машчэннем асновы

падлогі. Унутраная сцяна, таўшчынёй 14-15 см, была вертыкальнай і роўнай, а яе ўнутраная паверхня была пакрытая тонкай вапнава-цамянкавай рошчынай. Гэтая муроўка можа разглядацца як сценка саркафага ў ніжняй частцы аркасольнай нішы. Шырыня месца пахавання складала 56 см.

Відавочна, што дадзеная пахавальня была зроблена для значнай асобы, якая мела дачыненне да дзейнасці ўсяго манастыра і царквы непасрэдна. Гэтая асоба памерла неўзабаве пасля ўзвядзення царквы і была пахаваная ў аркасоліі.

Знешняя сцяна агароджы нішы мела вышыню 34 см ад верхняй адзнакі падмурка папярочнай сцяны галерэі. Унутраная сцяна захавалася на вышыню 45 см ад падлогі пахавальні і на 38 см ад верхняга ўзроўню падмурка папярэчнай сцяны.

Падлога пахавальні была вымашчаная плінфай і знаходзілася на 10 см глыбей за верхні абрэз падмурка храма і папярочных сцен галерэі. Для ўладкавання падлогі на глыбіню да 30 см быў разабраны знешні выступ падмурка. Пад глінянае машчэнне была падрыхтаваная падсыпка з пяска і гумусу з будаўнічым смеццем.

Унутраныя паверхні нішы, у тым ліку і размешчаныя ніжэй за верхні ўзровень падмурка паўднёвай сцяны храма, былі зніваліраваныя муроўкай з плінфы і пакрытыя старанна зацёртай вапнава-цамянкавай рошчынай. На заходняй сцяне аркасольнай нішы на тынкоўцы адбілася перакрыцце пахавальні. Магчыма, яно ўяўляла сабой суцэльную пліту і размяшчалася на вышыні 38 см ад узроўню абрэза падмурка сцен, што адпавядае верху ўнутранай сценкі агароджы пахавальні. Над адбіткам перакрыцця на заходняй сцяне нішы захаваўся ўчастак фрэскі (з фонам цёмна-бардовага колеру).

Арачнае завяршэнне аркасолія не захавалася, але ўсю ніжнюю частку прасла вышэй машчэння XVIII ст. займае муроўка з брусковай цэглы на вапнава-пясчанай рошчыне, што распаўсюджаная і на лапаткі з паўкалонамі. У інтэр'еры царквы на дадзеным участку фасада існуе глыбокая аркасольная ніша, закладзеная цэглай пры рамонце ў XVIII ст. Пад гэтую муроўку быў зроблены падмурак з валуноў, прысыпаны будаўнічым смеццем, які ўтрымліваў фрагменты фрэсак XII ст. Валуны абапіраюцца на старажытную муроўку, відаць, разабраную для ўладкавання гэтага аснавання. Валунны падмурак падымаецца да ўзроўню машчэння XVIII ст. Для яго ўладкавання пахавальня ў аркасоліі папярэдне была запоўнена гумусам з будаўнічым смеццем. Сярод кавалкаў плінфы і цамянкавай рошчыны ў гэтым запаўненні знаходзілася шмат фрагментаў фрэсак XII ст. Тут жа была зробленая галоўная рухомая археалагічная знаходка сезона-2017 – пячатка Еўфрасінні Полацкай.

Свінцовая пячатка з імем Еўфрасінні знойдзена ў сярэдзіне запаўнення саркафага аркасолія на фасадзе заходняга прасла наоса царквы. Дадзены прадмет трапіў на гэтае месца, верагодна, пры рамонце царквы ў XVIII ст. У гэты час галерэі царквы былі ўжо разабраныя.

Круглыя віслыя пячаткі выкарыстоўваліся для замацавання дакументаў і тым самым пацвярджалі іх сапраўднасць. Яны мелі шырокае распаўсюджванне на тэрыторыі Старажытнай Русі. На знойдзенай пячатцы на адным баку адціснута выява Ісуса Хрыста Пантакратара, на другой – святой Еўфрасінні Александрыйскай – апякункі Еўфрасінні Полацкай. Вакол выявы Еўфрасінні зроблены надпіс "*Иефросінi*". Выява Еўфрасінні Александрыйскай на пячатцы зрэзаная вострым інструментам. Факт наўмыснага псавання пячаткі ў старажытнарускіх матэрыялах сустракаецца ў першыню[11].

Вышыня сцен, якія аддзяляюць ніжнюю прастору аркасолія, адбітак перакрыцця пахавальні і фрэска над ім – усё ўказвае на ўзровень паверхні падлогі ў інтэр'еры дадзенага кампартымента галерэі. Падлога знаходзілася на вышыні 38 см над узроўнем падмурка папярочнай сцяны галерэі, размешчанай на восі заходняй лапаткі наоса і падмурка паўднёвай сцяны. Такім чынам, муроўка захаванага фрагмента сцяны падымаецца вышэй за падлогу амаль на 20 см, і ў ёй на гэтай вышыні не было праёма. Малаверагодна, што праём мог быць размешчаны вышэй, у такім выпадку у ім павінен быць занадта высокі парог. У той жа час два ўсходнія адсекі галерэі мусілі межаваць паміж сабой, такім чынам яны стваралі асобны замкнуты аб'ём, які складаўся з двух памяшканняў.

Наяўнасць апсіды сведчыла аб прызначэнні ўсходніх памяшканняў галерэі. Відавочна, што ў іх размяшчалася прыдзельная царква з вузкім нартэксам. У 2015 г. у шурфе 3 ў інтэр'еры кампартымента галерэі каля цэнтральнага прасла паўднёвага фасада наоса была выяўлена пабудаваная з плінфы пахавальня, размешчаная пад падлогай старажытнай пабудовы[12]. Пахавальні і аркасолій у паўднёвай сцяне храма сведчаць, што прыдзел быў прызначаны для пахаванняў і, верагодна, богаслужэнняў па нябожчыках.

На захад ад прыдзела на плошчы раскопу не было знойдзена папярочных сцен галерэй XII ст. Сцяна, якая магла размяшчацца па восі сучаснай заходняй кутняй лапаткі XII ст., не захавалася. Толькі ў паўднёвай сценцы раскопу знойдзены моцна пашкоджаны фрагмент муроўкі з плінфы. У ім дзякуючы невялікаму ўчастку інтэр'ернай тынкоўкі, што ўтварала ўнутраны вугал, выяўлены выступ муроўкі шырынёй 0,9 м і даўжынёй да 0,44м. Ён размешчаны насупраць сучаснай першапачатковай заходняй кутняй лапаткі XII ст. на фасадзе царквы. Магчыма, гэты выступ служыў апірышчам для аркі. На супрацьлеглым баку гэтая арка магла абапірацца на сцяну, знішчаную пры будаўніцтве спуску ў крыпту XVIII ст.



*Аркасольная ніша ў паўднёвай сцяне, заходняя сценка, від з усходу і захаду.*

*Спаса-Праабражэнскі храм Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра.* План-рэканструкцыя храма XII ст. (варыянт 2017 г.)




Сам фрагмент муроўкі ў паўднёвай сцяне раскопу належаў ужо да паўднёвай сцяны галерэі. Астатнія канструкцыі гэтай сцяны былі амаль цалкам знішчаныя пазнейшымі пахаваннямі.

У заходняй частцы раскопу 2017 г. былі адкрыты вялікія ўчасткі гарызантальных залівак, выкананых на вапнава-цамянкавай рошчыне, якія перакрываюць машчэнні з плінфы. Усе гэтыя канструкцыі з'яўляюцца рэшткамі падлогі XII ст. у заходнім памяшканні паўднёвай галерэі.

У паўднёва-заходнім куце раскопу 1 пад слоем рошчыннай падрыхтоўкі пад падлогу XII ст. часткова раскрытая паверхня зводу з плінфы на вапнава-цамянкавай рошчыне. Корабавае скляпенне, верагодна, перакрывала невялікую камеру, узведзеную ў XII ст. яшчэ да будаўніцтва падлогі ў інтэр'еры паўднёвай галерэі. Гэтая камера выходзіла за межы раскопу і ў 2017 г. не даследавалася. Размяшчэнне асноўнай часткі падземнай камеры за межамі раскопу сведчыць таксама, што заходняя прастора паўднёвай галерэі не спынялася па восі паўднёва-заходняй кутняй лапаткі царквы і працягвалася ў заходнім накірунку, дзе злучалася з заходняй галерэяй храма.

Архітэктурна-археалагічныя даследаванні 2017 г. сталі працягам даследаванняў 2015 г., калі былі атрыманыя першыя, а таму і зусім нечаканыя даныя аб наяўнасці старажытных галерэй каля храма. У 2017 г. нашыя ўяўленні аб плане галерэй Спаскай царквы былі істотна ўдакладнены. Наяўнасць паўднёвага прыдзела па восі цэнтральнага прасла наоса прадугледжвае падобнае сіметрычнае размяшчэнне такога ж прыдзела каля паўночнай сцяны. У гэтым выпадку кампазіцыя плана Спаскай царквы збліжае яе з іншымі архітэктурнымі помнікамі Полацка XII ст., дзе прыменена такое рашэнне. Сярод іх царква на Верхнім замку (царква Арханёла Міхаіла) і царква Арханёла Міхаіла ў Смаленску. Сіметрычныя прыдзелы разглядаюцца як адна з прыкмет полацкай архітэктурнай традыцыі XII ст.[13].

У выніку даследаванняў удалося дакладна вызначыць, што ад самага пачатку Спаса-Праабражэнская царква будавалася як храм-пахавальня. Пахаванні размяшчаліся ў раскапаных рэштках прыдзелаў і дадзенай традыцыі прытрымліваліся і ўXII ст., і значна пазней.

Выяўлены старажытны аркасолій у прыдзеле сведчыць аб выкарыстанні царквы ў якасці пахавальні для вельмі значнай для манастыра асобы. На жаль, само пахаванне не захавалася. Знойдзеная ў запаўненні культурнага слоя каля аркасолія свінцовая віслая пячатка Еўфрасінні Полацкай можа сведчыць аб прыналежнасці дадзенага артэфакта да пахавальнага інвентару асобы з аркасолія.

Цікавай асаблівасцю галерэй Спаскай царквы з'яўляецца ізаляванасць двух паўднёвых кампартыментаў. Прыдзелы каля бакавых фасадаў храма, такім чынам, складаліся з двух памяшканняў: наоса і нартэкса. Гэта некалькі адрознівае Спаскую царкву ад названых вышэй пабудоў полацкай школы дойлідства і, магчыма, з'яўляецца індывідуальнай асаблівасцю.

[1] Ярмохін М., Вітас А., Калечыц І. Дэндрахраналагічнае датаванне будаўніцтва Полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы // Беларускі гістарычны часопіс. 2016. №8. С. 13-19.

[2] Иоаннисян О.М. Зодчество первой половины – середины XII века // История русского искусства. Т. 2/1. Искусство 20-60-х годов XII века. Москва, 2012. С. 119; Раппопорт П.А. Древнерусская архитектура. Санкт-Петербург, 1993. С. 62-63.

[3] Сарабьянов В.Д. Спасская церковь Евфросиниевского монастыря в Полоцке. 3 изд. Полоцк, 2016.

[4] Торшын Я., Дук Д., Коц А., Іаанісян А., Зыкаў П. Спасціжэнне першапачатковай задумы архітэктуры Полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы: па выніках даследаванняў 2015 года // Беларускі гістарычны часопіс. 2016. № 7. С. 15-16; Торшин Е.Н., Дук Д.В., Иоаннисян О.М., Зыков П.Л., Коц А.Л. Галерея Спасо-Преображенской церкви Евфросиньева монастыря в Полоцке (предварительные итоги архитектурно-археологических исследований) // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: зборнік навуковых артыкулаў III міжнар. навук.-практ. канф., Полацк, 14-15 крас. 2016 г.: у 2 ч. Ч. 1. Навапалацк, 2016. С. 22-40; Иоаннисян О.М., Торшин Е.Н., Зыков П.Л., Дук Д.В. Работы архитектурно-археологической экспедиции в Полоцке в 2015 году // Археологический сборник. 41 выпуск: материалы и исследования по археологии Евразии. Государственный Эрмитаж. Санкт-Петербург, 2017. С. 323-324.

[5] Раппопорт П.А. Строительное производство Древней Руси. Санкт-Петербург, 1994. С. 119.

[6] Раппопорт П.А. Строительное производство Древней Руси. С. 89; Оустерхаут Р. Византийские строители. Киев-Москва. 2005. С. 223-225.

[7] Торшын Я., Дук Д., Коц А., Іаанісян А., Зыкаў П. Спасціжэнне першапачатковай задумы архітэктуры Полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы: па выніках даследаванняў 2015 года. С. 8; Иоаннисян О.М., Торшин Е.Н., Зыков П.Л., Дук Д.В. Работы архитектурно-археологической экспедиции в Полоцке в 2015 году. С. 326.

[8] Торшын Я., Дук Д., Коц А., Іаанісян А., Зыкаў П. Спасціжэнне першапачатковай задумы архітэктуры Полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы: па выніках даследаванняў 2015 года. С. 15.

[9] Торшын Я., Дук Д., Коц А., Іаанісян А., Зыкаў П. Спасціжэнне першапачатковай задумы архітэктуры Полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы: па выніках даследаванняў 2015 года. С. 13; Иоаннисян О.М., Торшин Е.Н., Зыков П.Л., Дук Д.В. Работы архитектурно-археологической экспедиции в Полоцке в 2015 году. С. 328.

[10] Торшын Я., Дук Д., Коц А., Іаанісян А., Зыкаў П. Спасціжэнне першапачатковай задумы архітэктуры Полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы: па выніках даследаванняў 2015года. С. 11; Иоаннисян О.М..Торшин Е.Н., Зыков П.Л., Дук Д.В. Работы архитектурно-археологической экспедиции в Полоцке в 2015 году. С. 328.

[11] Дук Д., Калечыц І., Коц А., Торшын Я. Парадная пячатка Еўфрасінні Полацкай // Беларускі гістарычны часопіс. 2017. №9. С. 4-8.

[12] Торшын Я., Дук Д., Коц А., Іаанісян А., Зыкаў П. Спасціжэнне першапачатковай задумы архітэктуры Полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы: па выніках даследаванняў 2015 года. С. 12-13; Иоаннисян О.М., Торшин Е.Н., Зыков П.Л., Дук Д.В. Работы архитектурно-археологической экспедиции в Полоцке в 2015 году. С. 329.

[13] Иоаннисян О.М. Зодчество первой половины – середины XII века. С. 119; Раппопорт П.А. Древнерусская архитектура. С. 118-124.

**Торшын Яўген Мікалаевіч** (Расія, Санкт-Пецярбург), загадчык сектара архітэктурнай археалогіі Дзяржаўнага Эрмітажа, кандыдат гістарычных навук;

**Дук Дзяніс Уладзіміравіч** (Беларусь, Магілёў), рэктар Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А.Куляшова, доктар гістарычных навук, прафесар;

**Зыкаў Пётр Леанідавіч** (Расія, Санкт-Пецярбург), старшы навуковы супрацоўнік сектара архітэктурнай археалогіі Дзяржаўнага Эрмітажа, архітэктар;

**Коц Аляксей Леанідавіч** (Беларусь, Полацк), выкладчык кафедры гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, магістр гістарычных навук.